# *§ 5–0. Крызіс традыцыйнага грамадства ў краінах Усходу

**КАЛОНІЯ МЕТРАПОЛІЯ**
**ТРАДЫЦЫЙНАЕ ГРАМАДСТВА**
**ФЕАДАЛЬНЫЯ АДНОСІНЫ**
**МАДЭРНІЗАЦЫЯ**
**ІНДЫЙСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ КАНГРЭС**
**РЭВАЛЮЦЫЯ МЭЙДЗІ**

**Сутнасць каланіялізму**

**1. Каланіялізм як ідэалогія і палітыка.** У другой палове XIX — пачатку XX ст. каланіялізм ператварыўся ў адну з вызначальных сіл сусветнай палітыкі і найважнейшы фактар развіцця краін Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі на працягу многіх дзесяцігоддзяў. Каланіялізм уяўляў сабой сістэму поглядаў і дзеянняў, скіраваную на заваяванне, падпарадкаванне і эксплуатацыю народаў менш развітых у эканамічных адносінах краін.

Успомніце, якія дзяржавы ажыццяўлялі каланіяльную экспансію ў XIX — пачатку XX ст.

**Ідэалагічная аснова каланіялізму**

Ідэалагічнай асновай каланіялізму служыла тэорыя сацыяльнага дарвінізму, што атрымала пашырэнне напрыканцы XIX ст. Гэтая псеўданавуковая тэорыя пераносіла законы біялагічнага натуральнага адбору на чалавечае грамадства і сцвярджала перавагу еўрапейскай «белай расы» над іншымі народамі. Сацыял-дарвіністы лічылі, што еўрапейцы належаць да «найвышэйшай расы» і таму маюць права кіраваць «ніжэйшымі народамі».

**Перадумовы каланіялізму**

**ПЕРАДУМОВЫ КАЛАНІЯЛІЗМУ**

| Эканамічныя | Палітычныя | Культурна-рэлігійныя |
|---|---|---|
| Неабходнасць доступу да крыніц таннай сыравіны (бавоўна, каўчук, чай, кава, прыправы, нафта), патрэба ў новых рынках збыту прамысловых тавараў і таннай рабочай сіле | Барацьба за стратэгічныя ваенныя базы, кантроль над найважнейшымі марскімі шляхамі, пралівамі і гандлёвымі цэнтрамі | Пашырэнне еўрапейскай адукацыі, мовы і хрысціянства сярод «нецывілізаваных» народаў |

**2. Асноўныя этапы, формы і метады каланіяльнай экспансіі.** У гісторыі каланіяльнай экспансіі можна вылучыць некалькі асноўных этапаў.

**XVI–XVIII стст.** — Першая хваля каланіялізму была звязаная з дзейнасцю Іспаніі, Партугаліі і Нідэрландаў, пазней да іх далучыліся Англія і Францыя. Гэты перыяд насіў пераважна гандлёва-заваявальны характар: еўрапейцы змагаліся за кантроль над марскімі шляхамі, стваралі гандлёвыя факторыі і захоплівалі стратэгічна важныя тэрыторыі

**XIX ст.** — Другая хваля каланіялізму была звязаная з індустрыяльнымі дзяржавамі і характарызавалася пераходам ад гандлёвага да прамысловага каланіялізму. У гэты перыяд калоніі і залежныя тэрыторыі ператварыліся ў рынкі збыту прамысловай прадукцыі метраполій

**Канец XIX — пачатак XX ст.** — Трэці этап вызначаўся вывазам капіталу ў калоніі, што стымулявала іх абмежаванае прамысловае развіццё пад кантролем метраполій

### Формы каланіяльнага панавання

Напачатку XX ст. склалася разнастайная сістэма формаў каланіяльнай залежнасці.

1. *Калоніі прамога кіравання* (напрыклад, Брытанская Індыя, французскі Алжыр), дзе каланіяльная адміністрацыя цалкам падпарадкоўвалася

метраполіі і кіравалася праз прызначаных губернатараў.

2. *Пратэктараты* — фармальна незалежныя дзяржавы пад апекай еўрапейскай дзяржавы (Егіпет пад брытанскім пратэктаратам, Туніс і Марока пад французскім). Мясцовыя кіраўнікі захоўваліся, але рэальныя рашэнні прымалі еўрапейскія прадстаўнікі.

3. *Паўкалоніі* — фармальна незалежныя дзяржавы, звязаныя нераўнапраўнымі дамовамі і падзеленыя на сферы ўплыву (Кітай пасля опіумных войнаў, Іран, Асманская імперыя). Такія краіны захоўвалі вонкавыя атрыбуты суверэнітэту, але іх эканоміка і знешняя палітыка кантраляваліся вялікімі дзяржавамі.

4. *Дамініёны* — калоніі з пераважна еўрапейскім насельніцтвам, якія валодалі шырокай аўтаноміяй (Канада, Аўстралія, Новая Зеландыя, Паўднёва-Афрыканскі саюз).

**Метады каланіяльнай эксплуатацыі**

Эканамічныя метады каланіяльнай эксплуатацыі ўключалі ўсталяванне гандлёвых манаполій, прымусовае вырошчванне таварных культур і вываз сыравіны па заніжаных коштах. Яскравым прыкладам быў навязаны Вялікабрытаніяй Кітаю опіумны гандаль, які не толькі прыносіў велізарныя даходы, але і разбураў кітайскае грамадства знутры.

Палітычныя метады прадугледжвалі жорсткае падаўленне антыкаланіяльных выступленняў, умяшанне ва ўнутраныя справы і выкарыстанне ваеннай сілы для падтрымання парадку.

Культурныя метады ўключалі насаджэнне еўрапейскіх моў і сістэмы адукацыі, дыскрымінацыю мясцовых традыцый і спробы замяніць традыцыйныя рэлігійныя інстытуты на еўрапейскія формы светапогляду.

**Метраполіі**

**3. Метраполіі і калоніі.** Каланіяльная сістэма прыносіла метраполіям каласальныя выгады. Доступ да таннай сыравіны — бавоўны з Індыі, чаю і опіуму

з Кітая, каўчуку з Малаі, нафты з Блізкага Усходу — забяспечваў хуткае развіццё еўрапейскай прамысловасці. Калоніі былі абароненымі рынкамі збыту, куды метраполіі экспартавалі гатовыя тавары. Гэта спрыяла паскарэнню індустрыялізацыі, назапашванню капіталу і росту дабрабыту каланіяльных дзяржаў.

**Калоніі**

Для каланіяльных тэрыторый наступствы былі разбуральныя. Іх эканоміка падпарадкоўвалася выключна патрэбам метраполій, традыцыйныя рамёствы прыходзілі ў заняпад пад ціскам танных фабрычных тавараў. Фарміраванне монакультурнага тыпу гаспадаркі рабіла калоніі надзвычай уразлівымі да неўраджаяў і эканамічных крызісаў. Паўсюль раслі падатковы ціск, голад і галеча насельніцтва.

**Каланіяльная сістэма**

**4. Каланіяльная сістэма.** Напачатку XX ст. сфарміравалася глабальная каланіяльная сістэма, якая ахапіла практычна ўвесь свет. На 1914 г. калоніі і залежныя краіны займалі каля 67 % тэрыторыі і 60 % насельніцтва зямнога шара.




**Супярэчнасці каланіяльнай сістэмы**

Каланіяльная сістэма была крыніцай глыбокіх супярэчнасцей. З аднаго боку, яна забяспечвала

метраполіям велізарныя прыбыткі і паскарала іх эканамічнае развіццё. З іншага боку, яна выклікала рост супраціву прыгнечаных народаў, разбурала традыцыйны лад жыцця ў калоніях і ўзмацняла сацыяльныя ўзрушэнні.

Напачатку XX ст. барацьба за перадзел падзеленага ўжо свету рабілася адной з галоўных прычын росту напружання паміж вялікімі дзяржавамі, што ў рэшце рэшт прывяло да Першай сусветнай вайны.

Каланіяльная экспансія спрыяла росту нацыянальна-вызваленчых рухаў. Менавіта ў гэты перыяд на Усходзе з'явіліся першыя арганізаваныя нацыянальныя партыі і рухі. Індыйскі нацыянальны кангрэс, антыкаланіяльныя паўстанні ў Кітаі, фарміраванне новых палітычных эліт у калоніях — усё гэта прадвяшчала будучыя рэвалюцыі і барацьбу за незалежнасць.

Ператварэнне калоній у аграрна-сыравінныя прыдаткі метраполій перашкаджала іх збалансаванаму развіццю і стварала перадумовы для доўгатэрміновай эканамічнай адсталасці.

**5. Індыя пад уладай англічан.** Асаблівае значэнне для Англіі ў другой палове XIX ст. набылі яе каланіяльныя ўладанні ў Індыі. Эканамічнае развіццё гэтай краіны было цалкам падпарадкавана інтарэсам брытанскага капіталу. Тым не менш у Індыі паступова фарміравалася свая, нацыянальная буржуазія.

**Каланіяльная залежнасць Індыі**

У 1885 г. прадстаўнікі адукаваных колаў грамадства, якія атрымалі адукацыю ў Англіі (юрысты, дактары, журналісты, дзяржаўныя служачыя, землеўладальнікі), заснавалі арганізацыю *Індыйскі нацыянальны кангрэс (ІНК)*. Першапачаткова яны лаяльна ставіліся да каланіяльнага рэжыму, патрабавалі правядзення рэформаў і ўдзелу ў кіраванні краінай.

**Утварэнне Індыйскага нацыянальнага кангрэса**

### ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

У снежні 1885 г. у Бамбеі адбыўся ўстаноўчы з'езд Індыйскага нацыянальнага кангрэса — першай у гісторыі старажытнай краіны нерэлігійнай, па сутнасці парламенцкай, агульнанацыянальнай арганізацыі. У сваім звароце да ўдзельнікаў гэтай сесіі яе старшыня В. Ч. Банерджы наконт пытання галоўных задач новай партыі выказаў такую думку: «Выкараненне ўсіх расавых, рэлігійных і нацыянальных забабонаў сярод патрыётаў нашай краіны праз прамыя сяброўскія, асабістыя зносіны адно з адным, а таксама развіццё і кансалідацыю настрояў нацыянальнага адзінства, якія бяруць свой пачатак у часах незабыўнага праўлення віцэ-караля Індыі лорда Рыпана».

1. *Вызначце, якія задачы ставіў перад сабой Індыйскі нацыянальны кангрэс.*
2. *Як лідары Індыйскага нацыянальнага кангрэса ставіліся да англійскай каланіяльнай адміністрацыі?*

Напачатку XX ст. Кангрэс паставіў сваёй мэтай дабіцца, каб Індыі было дадзена самакіраванне ў межах Брытанскай імперыі мірнымі сродкамі.

Ператварэнне Кітая ў паўкалонію

**6.Ператварэнне Кітая, Ірана і Асманскай імперыі ў паўкалоніі.** Пасля паражэння ў «опіумнай вайне» *1840–1842 гг.* Кітай пачаў ператварацца ў паўкалонію еўрапейскіх дзяржаў, якія разам з Японіяй навязалі яму напрыканцы XIX ст. шэраг нераўнапраўных дамоў.

У 1870–1880-я гг. у Кітаі з'явіліся першыя нацыянальныя прадпрыемствы, пачала фарміравацца нацыянальная буржуазія. Яе прадстаўнікі, а таксама патрыятычна настроеная знаць пачалі крытыкаваць існуючы лад. Цынская дынастыя зрабіла спробу памяркоўных рэформаў, аднак яны не былі падтрыманыя большай часткай феадальнага класа. Рэвалюцыйныя дэмакраты, якія выступалі за рэспубліканскую форму праўлення, стварылі тайную рэвалюцыйную арганізацыю — «Саюз адраджэння Кітая». У гэты ж час, на зломе стагоддзяў,

у Кітаі адбылося моцнае паўстанне іхэтуаняў супраць чужаземцаў (баксёрскае паўстанне). Яно было падаўлена, і залежнасць Кітая ад заходніх дзяржаў яшчэ больш узмацнілася, аж да таго, што Цыны абавязваліся падаўляць у краіне ўсякае выступленне супраць еўрапейцаў.

**Ператварэнне Ірана ў паўкалонію**

Другая палова XIX ст. была перыядам актыўнай каланіяльнай экспансіі ў Іран еўрапейскіх краін, перш за ўсё Англіі і Расіі. Сфарміраваліся сферы ўплыву дзвюх дзяржаў: Англіі — на поўдні Ірана, Расіі — на поўначы, у тым ліку ў Тэгеране. У 1907 г. яны заключылі пагадненне аб падзеле сфер уплыву ў Іране, Афганістане і Тыбеце. Гэта дазволіла прызначаць замежнікаў на ключавыя пасады і стварыць узброеныя сілы пад кіраўніцтвам замежных афіцэраў. Шахскі ўрад рабіўся правадніком замежнай палітыкі, што прывяло да завяршэння працэсу ператварэння Ірана ў паўкалонію.

**Асманская імперыя**

У XIX ст. еўрапейскія дзяржавы актывізавалі барацьбу за тэрытарыяльны падзел Асманскай імперыі. Францыя захапіла Алжыр, Англія акупавала Егіпет, над Марока быў усталяваны французскі пратэктарат. Некалі магутная дзяржава развальвалася літаральна на вачах. І толькі супярэчнасці паміж вялікімі дзяржавамі перашкодзілі ажыццявіць поўны падзел Асманскай імперыі да Першай сусветнай вайны.

**Рэвалюцыя Мэйдзі**

**7. Японскі вопыт мадэрнізацыі.** Найважнейшай падзеяй у гісторыі Японіі зрабілася Рэстаўрацыя Мэйдзі, вядомая таксама як Рэвалюцыя Мэйдзі 1868 г., у выніку якой была зрынутая ўлада феадальнага дому Такугава і адноўлена імператарская ўлада.

**Буржуазныя рэформы**

Пагроза з боку заходніх дзяржаў, якія намагаліся закабаліць Японію, прымусіла кіруючыя колы стаць на шлях стрыманых буржуазных *рэформаў Мэйдзі («асветнае праўленне»)*.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



Муцухіта (1852–1912), які пасмяротна атрымаў імя Імператар Мэйдзі, — 122-і імператар Японіі паводле традыцыйнай паслядоўнасці перадачы трона і першы манарх Японскай імперыі. Узышоў на трон 3 лютага 1867 г., адхіліўшы ад улады сёгунат Такугава. За час яго праўлення Японія прайшла праз палітычную, сацыяльную і прамысловую рэвалюцыі і ператварылася ў адну з наймацнейшых сусветных дзяржаў. Артыкул «Нью-Ёрк Таймс», прысвечаны пахаванню імператара, заканчваўся словамі: «Кантраст паміж тым, што ішло наперадзе пахавальнай карэты, і тым, што ішло ззаду яе, сапраўды ўражваў. Перад ёю ішла старая Японія, за ёю — новая Японія».

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, дайце характарыстыку асобе імператара, ацаніце значэнне яго пераўтварэнняў.*
2. *Эпоха праўлення імператара Муцухіта атрымала назву «Мэйдзі», або «асветнае праўленне». Як вы лічыце, у чым выяўляўся «асветны» характар праўлення імператара?*
3. *Як вы лічыце, у чым журналісты «Нью-Ёрк Таймс» бачылі розніцу паміж «старой» і «новай» Японіяй?*

Рэфарматары скасавалі феадальную ўласнасць на зямлю; ліквідавалі раздробленасць краіны на княствы і ўвялі прэфектуры; выдалі дэкрэт аб усеагульнай вайсковай павіннасці, які пазбавіў самураяў іх манапольных прывілеяў. У краіне была ўведзена адзіная судовая сістэма, адмяняліся абмежаванні для прадпрымальніцтва і гандлю. З дзяржаўнай ініцыятывы пачалася індустрыялізацыя краіны. У Японіі хутка працякаў працэс канцэнтрацыі капіталу і вытворчасці.

**Прыняцце канстытуцыі**

У *1889 г.* была прынятая канстытуцыя, што праіснавала ў нязменным выглядзе да 1947 г. У краіне ўводзіўся двухпалатны парламент з вельмі абмежаванымі функцыямі. Усёй паўнатой улады валодаў

імператар. Яго асоба абвяшчалася свяшчэннай і недатыкальнай. Ніжняя Палата прадстаўнікоў знаходзілася пад кантролем урада, які нёс адказнасць толькі перад імператарам.

#### Фарміраванне буржуазнага ладу

У цэлым Японія ўзяла курс на мадэрнізацыю і пераход да новага, буржуазнага ладу, запазычыла ў Захаду многія яго дасягненні. Капіталістычная эканоміка пачала паступова выцясняць феадальны лад.

#### Знешняя палітыка Японіі

Неўзабаве Японія пачала праводзіць агрэсіўную палітыку каланіяльных захопаў, якая шмат у чым падсілкоўвалася адсутнасцю рэсурсаў для эканомікі, што хутка расла. Яна атрымала перамогу ў японакітайскай вайне 1894–1895 гг. і атрымала ад Кітая востраў Тайвань. Пасля нанесла паражэнне Расіі ў руска-японскай вайне 1904–1905 гг. Згодна з Портсмутскай мірнай дамовай Японія замацавала за сабой Карэю, атрымала ад Расіі Паўднёвы Сахалін і правы на арэнду кітайскіх партоў Порт-Артур і Дальні (цяпер — Люйшунь і Далянь). Пасля гэтага Японія заняла месца ў шэрагу буйны́х каланіяльных дзяржаў, ператварылася ў наймацнейшую прамысловую і ваенную дзяржаву Далёкага Усходу.

*Каланіялізм уяўляў сабой не толькі палітыку ваеннага і эканамічнага падпарадкавання, але і цэласную сістэму поглядаў, якая абгрунтоўвала панаванне Захаду над Усходам. Традыцыйнае грамадства Усходу не магло супрацьстаяць больш развітой грамадска-эканамічнай сістэме Захаду. Большасць краін Азіі і Афрыцы ператварыліся ў калоніі. Кітай, Іран, Асманская імперыя захавалі палітычную самастойнасць, але ў эканамічных адносінах былі залежнымі ў выніку навязаных ім нераўнапраўных дамоў. Адна Японія ў другой палове XIX ст. здолела не толькі захаваць незалежнасць, але і стаць на шлях капіталістычнага развіцця, ажыццявіць шэраг радыкальных рэформаў.*

| калі ў свеце… | на тэрыторыі Беларусі… |
|---|---|
| 1860–1880-я гг. — правядзенне буржуазных рэформаў Мэйдзі ў Японіі | 1860–1887 гг. — правядзенне буржуазных рэформаў у Беларусі |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Дайце вызначэнне тэрміну «каланіялізм». Якая тэорыя лягла ў ідэалагічную аснову каланіялізму?
2. Вылучыце асноўныя этапы каланіялізму. Вызначце формы і метады каланіяльнай эксплуатацыі залежных тэрыторый.
3. Ахарактарызуйце асноўныя рысы каланіяльнай сістэмы. У чым выяўлялася супярэчлівасць каланіяльнай сістэмы?
4. Прааналізуйце працэс ператварэння Кітая, Ірана і Асманскай імперыі ў паўкалоніі. Чаму краіны Усходу не маглі гэтаму супрацьстаяць?
5. У чым была сутнасць японскай мадэрнізацыі? Якія рэформы былі праведзены? Апішыце характар гэтых рэформаў.